Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 81'271

ПАДЗЯКА Ў ЭПІСТАЛЯРНЫМ ТЭКСЦЕ: РЭЖЫМЫ І СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ

Аўтар: Доўгаль Дзмітрый Аляксандравіч, старшы выкладчык кафедры беларускай і рускай моў.

Кантактная інфармацыя: тэл.: +375296560187, эл. пошта: dzmitry_douhal@list.ru.

Апісанне: *У артыкуле апісваюцца рэжымы і аналізуюцца сродкі выражэння падзякі ў эпісталярных тэкстах беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя.*

Description: *The article deals modes and means of expressing gratitude to the epistolary texts Belarusian writers of the 20th century.*

Галіна прымянення распрацоўкі: Адукацыя.

Укараненне распрацоўкі: Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова", 2015 год.

Асноўныя перавагі распрацоўкі: На значным матэрыяле для даследавання (больш як дзве тысячы лістоў адзінаццаці аўтараў) устаноўлены сродкі выражэння падзякі ў эпісталярных тэкстах беларускіх пісьменнікаў.

Уводзіны

Удзячнасцю называюць 'пачуццё, якое ўзнікае ў адказ за зробленае дабро, увагу' [1, с. 680]. Падзяка прадугледжвае вербальнае выражэнне гэтага пачуцця.

Асноўная частка

У эпісталярнай спадчыне беларускіх майстроў слова (матэрыялам для даследавання паслужылі больш за 2 тысячы апублікаваных лістоў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, К. Крапівы, М. Лынькова, П. Броўкі, І. Мележа, В. Быкава, У. Караткевіча і Р. Барадуліна, напісаных у 1912–2003 гадах) інфармацыя пра падзяку падаецца ў двух рэжымах – нарацыйным (апавядальным) і камунікацыйным. Пры выкарыстанні першага адрасант паведамляе пра маўленчы акт падзякі, сведкам ці ўдзельнікам якога ён быў (меркаваў быць): *Таму што я чалавек удзячны, і калі Саюз даў мне патрабаванні памяркоўныя і невялікія, я на праўленні* ***падзякаваў*** *ім* (У. Караткевіч да Л. Геніюш. Ліст ад снеж. 1963); *Я вось не паспеў яшчэ* ***аддзячыць*** *іх <вучняў> за надасланы падарунак (ракету), бо, не маючы магчымасці хадзіць па гораду, не змог набыць для іх што-небудзь цікавае* (М. Лынькоў да В. Лапіцкай. Ліст ад 27.05.1975). Як праявы гэтага рэжыму можна трактаваць тыя выпадкі, калі адрасант расказвае (але не просіць перадаць!) пра сваю ўдзячнасць у дачыненні да трэціх асоб: *Не, няпраўда, званіў Матукоўскі. І я вельмі* ***ўдзячны*** *гэтаму слаўнаму чалавеку. Як парадавала мяне яго добрая ўвага* (І. Мележ да Г. Шупенькі. Ліст ад 21.03.1972).

У камунікацыйным рэжыме, актуальным для маўленчага этыкету, падзяка ажыццяўляецца непасрэдна ў тэксце ліста пры дапамозе спецыяльных формул: *Найперш* ***дзякую*** *Вам дужа і шчыра за "Беларусаў"* (М. Гарэцкі да Я. Карскага. Ліст ад 18.08.1923); *Шчыру* ***падзяку прыношу*** *Вам за памяць аба мне, за пісьмо і тэлеграму* (Я. Колас да Ц. Гарбунова. Ліст ад 8.08.1943).

Пры выкарыстанні камунікацыйнага рэжыму падзяка можа выражацца як у спецыяльна прызначаным для гэтага монатэматычным пасланні, так і ўключацца ў лісты альбо ў якасці тэмы політэматычнага тэксту (a), альбо кампанента этыкетнай структуры паслання (b). Адрозненне паміж выпадкамі a і b палягае ў тым, што падзяка (a) з'яўляецца рэакцыяй на выкананае адрасатам ці трэцяй асобай дзеянне, не абумоўленае актуальнай перапіскай, а падзяка (b) служыць для пацвярджэння кантакту ў ліставанні, пар.: *(a)* ***Дзякую*** *за добры водгук аб паэме пра Смалячкова* (П. Броўка да Л.А. Бэндэ. Ліст ад 18.08.1943); *Мне прыслаў т. Кавалёў твае фельетоны.* ***Дзякую*** *табе за іх напісанне* (Я. Колас да К. Чорнага. Ліст ад 29.08.1942); *(b) Дарагі дзядзька Якуб! Атрымаў Ваша вялікае пасланне.* ***Дзякую*** *за памяць* (П. Броўка да Я. Коласа. Ліст ад 12.05.1948); *Дарагі Рыгор! Вельмі* ***дзякую*** *за паштоўку* (І. Мележ да Р.П. Піўтарака. Ліст ад 1.06.1963). Акрамя таго, гэтыя два выпадкі маюць розную лакалізацыю ў тэксце ліста: тэматычная падзяка (a) знаходзіцца ў асноўнай частцы, а падзяка (b) у фармуляры.

Камунікацыйны рэжым актуальны не толькі для сітуацый непасрэдных зносін па лініі "адрасант – адрасат", але і для выпадкаў выражэння падзякі трэцім асобам / ад

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

трэціх асоб: *Перадай маё* ***дзякуй*** *Аленцы Сяргееўне* (В. Быкаў да Р. Барадуліна. Ліст ад 1.02.1999); *Учора за сталом шмат гаварылі аб усім, між іншым, і аб "Жмені промняў". Ён, дзядзька, яшчэ раз* ***дзякуе*** (У. Караткевіч да Я. Брыля. Ліст ад 3.11.1965). У эпісталярыі, аднак, не адзначана прыкладаў падзякі ад трэціх асоб трэцім асобам, што сведчыць пра неабходнасць непасрэднага ўдзелу кагосьці з камунікантаў у маўленчаэтыкетнай сітуацыі.

Асобнага разгляду патрабуюць выпадкі выкарыстання формул падзякі на адрас Бога. Формулы *дзякуй богу (Богу)*, *дзякаваць богу (Богу)* найчасцей выкарыстоўваюцца як выказнік ці акалічнасць ў значэнні 'вельмі добра; вельмі многа; вялікі, значны' або для выражэння радасці, задавальнення, палёгкі ў значэнні пабочнага слова – гаварыць пра маўленчаэтыкетны характар гэтых адзінак не выпадае: ***Дзякую*** *богу, што валасоў на галаве мала і можна прычасацца зубачысткаю* (Я. Колас да М. Лынькова. Ліст ад 7.02.1953). Аднак інтэнцыя падзякі на адрас Бога можа быць рэалізавана ў пасланнях тых карэспандэнтаў, якія з'яўляюцца вернікамі. Так, у лістах Рыгора Барадуліна падобныя звароты рэгулярныя: *Як бы ні жылося,* ***дзякуй*** *Усеўладару за дазвол пагасцяваць тут.*(Р. Барадулін да В. Быкава. Ліст ад 5.06.2000); ***Дзякуй*** *Звышняму, што пабачыў цябе, пачуў, адчуў такую рэдкую ў наш час радасць* (Р. Барадулін да В. Быкава. Ліст ад 27.07.2000). Тут Бог выступае ў якасці звыш-адрасата, які для верніка з'яўляецца сведкам усіх учынкаў, у тым ліку і маўленчых, чалавека. У некаторых жанрах – напрыклад, малітве – Бог можа выступаць і як рэальны адрасат. Гэтым і абумоўлена магчымасць апісання падзякі на адрас Бога ў нарацыйным рэжыме: *Сёння ў калядны вечар* ***дзякаваў*** *Богу за ўсё* (Р. Барадулін да В. Быкава. Ліст ад 6.01.1999).

Асноўным сродкам выражэння падзякі ў эпісталярных тэкстах класікаў беларускай літаратуры з'яўляюцца моўныя адзінкі, у склад якіх уваходзяць лексемы з коранем *дзяк-*: *дзякую* (***Дзякую*** *п. Л. за тэмы, што ён мне надаслаў* (М. Багдановіч у рэдакцыю "Нашай нівы". Ліст ад 1.08.1912)); *дзякуй* (*Вы зрабілі першы і вялікі крок да нашай мэты,* ***дзякуй*** *Вам за гэта, добры Вы чалавек* (У. Караткевіч да Я. Коласа. Ліст ад 30.10.1952)); *удзячны* (*Дужа* ***ўдзячны*** *Вам за выклік і прабачце, што доўга не пісаў* (У. Караткевіч да З. Нядзелі. Ліст ад 4.10.1971)); *падзяка* (*Сардэчная* ***падзяка*** *Вам і дружыне і дзецям Канстанціна Юхімавіча за юбілейнае павіншаванне і слаўныя пажаданні маёй сціплай персоне* (М. Лынькоў да А. Данілкі. Ліст ад 22.02.1970)) і інш.

Гэтыя адзінкі складаюць аснову эксплiцытна- і імпліцытна-перфарматыўных выказванняў. Першыя ўключаюць так званы кананічны перфарматыў у форме 1-й асобы адзіночнага ліку (*дзякую*), другія, з'яўляючыся эквівалентнымі першым, тым не менш маюць адрозную ад іх форму выражэння (*дзякуй, удзячны*). Лексемы з *дзяк-* уваходзяць і ў аналітычныя мадыфікацыі перфарматыўных выказванняў (*прыношу падзяку, дазвольце падзякаваць*), якія ўжываюцца ў статусна-арыентаваных лістах: *Шчырую* ***падзяку прыношу*** *Вам за памяць аба мне, за пісьмо і тэлеграму* (Я. Колас да Ц. Гарбунова. Ліст ад 8.08.1943).

Аналіз пасланняў дазваляе сцвярджаць, што асноўным сродкам падзякі ў ліставанні з'яўляецца перфарматыўны дзеяслоў *дзякую*. Ён ужываецца ўсімі без выключэння аўтарамі, чые творы паслужылі крыніцай матэрыялу. Сямёра творцаў з адзінаццаці (М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, П. Броўка, К. Крапіва, І. Мележ) менавіта яго найчасцей выкарыстоўваюць для выражэння падзякі. Звяртае на сябе ўвагу тое, што гэта этыкема не з'яўляецца асноўнай для пісьменнікаў, якія нарадзіліся пазней за іншых (В. Быкаў (1924), У. Караткевіч (1930) і Р. Барадулін (1935)) і чыя творчасць цалкам належыць другой палове XX стагоддзя. У іх спадчыне на змену эксплiцытна-перфарматыўным выразам з дзеясловам *дзякую* прыходзяць імпліцытна-перфарматыўныя выказванні з лек-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

семай *дзякуй*. У ліставанні астатніх творцаў яна ўзнікае параўнальна позна (у Я. Коласа ў 1942 годзе, у І. Мележа – у 1961, у П. Броўкі – у 1975) і сустракаецца нячаста (у Я. Купалы, напрыклад, усяго 2 разы). Гэту змену можна разглядаць у святле ўзмацнення ўплыву рускай мовы на беларускае маўленне, паколькі "ў рускай мове пераважаюць імпліцытна-перфаматыўныя рэалізацыі экспрэсіваў. Напрыклад, пры выражэнні падзякі <…> якраз імпліцытна-перфарматыўныя выказванні з'яўляюцца галоўнай, найбольш частотнай, стылёва нейтральнай рэалізацыяй гэтых актаў: спасибо вам / тебе за..." [2, с. 124].

У маўленчай плыні формулы выражэння падзякі дапаўняюцца за кошт разнастайных інтэнсіфікатараў, пакліканых выявіць ступень удзячнасці адрасанта. Так, этыкема *дзякую* ўжываецца як з колькаснымі (*вельмі, дужа, надта*), так і якаснымі (*сардэчна, шчыра, горача, ад (усёй) душы, ад (усяго) сэрца*) інтэнсіфікатарамі, якія займаюць як прэпазіцыйнае, так і постпазіцыйнае становішча адносна асноўнага сродку. Дапускаецца і іх спалучэнне – *Найперш **дзякую** Вам **дужа** і **шчыра** за "Беларусаў"* (М. Гарэцкі да Я. Карскага. Ліст ад 18.08.1923).

Большасць адзначаных этыкетных формул можа быць выкарыстана і ў вусным маўленні, аднак заўважаецца і спецыфічная эпісталярная канструкцыя: *«Веч<ернюю> газ<ету>» атрымліваю, за што **шлю** Вам шчыры **дзякуй*** (Я. Купала да А.І. Луцкевіча. Ліст ад 6.04.1913), якая да таго ж выяўляе нацыянальную адметнасць, пар.: руск. **шлю спасибо*.

Пры ўсёй частотнасці формул з лексемамі з коранем *дзяк-* яны не з'яўляюцца адзінымі сродкамі выражэння падзякі. Гэта лёгка ўстанавіць, супаставіўшы вербальныя рэакцыі, якія ўзнікаюць у ліставанні ў адказ на некаторыя частотныя стымулы ўдзячнасці.

Вербальныя рэакцыі на некаторыя стымулы ўдзячнасці ў эпісталярным тэксце

Стымул удзячнасці	Вербальныя сродкі выражэння ўдзячнасці		
	Формулы падзякі	Эматывы	Вербалізаваныя жэсты
Атрыманае пісьмо	*Пісьмо Ваша атрымаў і за яго сардэчная **падзяка**.* (М. Лынькоў да Д. Кавалёва. Ліст ад 11.10.1943)	*Прыйшло ўрэшце пісьмо ад цябе. Як я **быў рады** яму!* (Я. Колас да М. Міцкевіч. Ліст ад 12.07.1923)	*За тваё пісьмо **цалую** цябе,* (Я. Колас да П. Глебкі. Ліст ад 14.12.1950)
Віншаванне	*За **павіншаванне дзякуй**.* (М. Лынькоў да Я. Брыля. Ліст ад 28.04.1965)	*Вельмі **рады быў** атрымаць ад цябе віншаванне з прысуджэннем прэміі!* (І Мележ да Л. Сушчанкі. Ліст ад 2.06.1972)	*Па-першае, горача **абнімаю** і **цалую** вас абаіх за **павіншаванні**.* (Я. Колас да М. Лынькова. Ліст ад 3.11.1950).

Як бачым, у эпісталярных тэкстах удзячнасць знаходзіць слоўнае выражэнне ў эматывах (*рады, цешуся* і інш.) і вербалізаваных жэстах (абдымкі, пацалункі, паклоны). У лістах могуць утварацца цэлыя комплексы формул, якія рэалізуюць асноўную функцыю маўленчага этыкету – устанаўліваць і падтрымліваць эфектыўную камунікацыю паміж людзьмі. У эпісталярнай спадчыне беларускіх пісьменнікаў сустракаюцца наступныя спалучэнні формул пры рэалізацыі падзякі:

– формула падзякі + формула зычэння: *За ўсё гэта <ліст і тэлефоннае прывітанне> наша **сардэчная падзяка** і самыя найлепшыя нашы **пажаданні**: добрага здароўя, добрага лячэння, слаўнага адпачынку і бадзёрага настрою* (М. Лынькоў да Я. Коласа. Ліст ад 19.10.1947);

– эматыў + формула падзякі: *Я не знаходжу адпаведных слоў, каб **выказаць** Вам, мілыя жанчыны-беларускі, маю **радасць** і маю **падзяку** за павіншаванне.* (Я. Колас да Л. Чарняўскай. Ліст ад 9.11.1927);

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– вербалізаваны жэст + формула падзякі: *Твая павіншавальная тэлеграма – першая. Я крэпка **абнімаю** і **цалую** цябе, мой мілы Пятрусь, і **дзякую** ад усяго сэрца.* (Я. Колас да П. Броўкі. Ліст ад 30.10.1942);

– формула падзякі + кампліментарнае выказванне: ***Дзякую** за кніжку пра В. Быкава. Гэта кніга гаворыць пра Вас як пра **ўдумлівага, глыбокага даследчыка**.* (І. Мележ да В. Бурана. Ліст ад 31.07.1976);

– формула падзякі + эматыў + камплімент: *Вельмі **дзякую** табе, Уладзімір Мікалаевіч, за тваё шчырае, братняе слова. Яно мяне па-сапраўднаму **ўсхвалявала**. З дзён юначых **я любіўтваё паэтычнае слова, захапляўсятваімі шматграннымі ведамі**, зайздрошчу ім і зараз, вось чаму я прыняў твае меркаванні так блізка да сэрца.* (П. Броўка да У. Дубоўкі. Ліст ад 3.05.1969).

Пры гэтым эматывы і вербалізаваныя жэсты найчасцей папярэднічаюць формулам падзякі (левы разварот), а кампліментарныя выказванні і формулы зычэння ідуць услед за імі (правы разварот).

Заключэнне

Эпісталярная спадчына беларускіх майстроў слова сведчыць пра разнастайнасць вербальных сродкаў выражэння падзякі ў нарацыйным і камунікацыйным рэжымах і дазваляе гаварыць як пра спецыфіку беларускіх маўленчаэтыкетных форм, так і пра іх дынаміку на працягу 20-га стагоддзя.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – Мінск : БелЭн, 2002. – 784 с.

2. Пісарэк, Л. Беларускі моўны этыкет на фоне рускага і польскага / Л. Пісарэк // Беларусіка=Albaruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыян., міжрэлігійн. і міжкультурн. узаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 2 / рэд. У. Конан [і інш.]. – Мінск : ННАЦ імя Ф. Скарыны, 1997. – С. 123–126.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова